*Ю. Г. Болатава, дацэнт*

# СТАРАВЕРЫ БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ І ПАДНЯПРОЎЯ

Расійскую дзяржаву да царкоўнай рэформы, якая адбылася ў сярэдзіне XVII ст., небеспадстаўна можна было лічыць тэацэнтрычнай дзяржавай, бо гэта была адзіная сацыякультурная сістэма, кіруючую ролю ў якой адыгрывала праваслаўная царква. Руская царква праводзіла богаслужэнні па адзіных правілах, якія былі прыняты і зацверджаны саборам 1550 г. Але царкоўныя рэформы патрыярха Нікана і эканамічныя рэформы Пятра І прывялі да значных перамен у рускім грамадстве: праваслаўе паступова здае свае дамінуючыя пазіцыі і становіцца адной з падсістэм у дзяржаве.

Афіцыйна паняцце “старавер” (сінонім “стараабрадзец”, “раскольнік”) у Расійскай імперыі з’явілася толькі ў 1906 г., калі быў прыняты ўказ “Об укреплении начал веротерпимости”. Згодна з указам да старавераў былі аднесены паслядоўнікі напрамкаў, якія “отправляли свое богослужение по старопечатным книгам” [2, с. 107].

Староверства як рэлігійная плынь і спецыфічная культурная мадэль “законсервавала” пэўныя рэлігійныя ўяўленні, традыцыі, звычаі, правілы жыцця, маральныя імператывы, густы, якія існавалі ў рускім грамадстве да царкоўнай рэформы. Як рэлігійная філасофія староверства працягвае традыцыі старажытнавізантыйскага багаслоўя і ўжо тры стагоддзі захоўвае сваю канфесію, мастацкі канон, звычаі і мову, сістэму выхавання і адукацыі.

Знешні выгляд і інтэр’ер староверскага малельнага дома вельмі просты. Храм часцей за ўсё аднакупальны ці двухкупальны. Форма купала – традыцыйная “цыбулінка”. Будавалі царкву з дрэва. Формы яе гарманічныя, памеры – суразмерныя чалавеку. Франтон без аздабленняў, увенчаны крыжам з тытлам. Унутры

памяшканне падзелена на дзве часткі: большую і меншую. Звычайнай алтарнай часткі і царскай брамы няма. Дэкаратыўная разьба адсутнічае. Ля пярэдняй сцяны – крыж. Справа ад яго абразы Ісуса Хрыста, злева – Багародзіцы. Абразоў наогул няшмат.

У XVII–XVIII стст. з прычыны расколу ў рускай праваслаўнай царкве на тэрыторыю Беларусі сталі масава перасяляцца людзі, якія не рассталіся з ідэаламі старой веры. Яны былі вымушаны пакінуць сваю радзіму з-за прыцясненняў з боку дзяржаўных улад і новай царквы. Так, на тэрыторыю Беларусі перасяліліся непакорныя купцы, рамеснікі, сяляне з Масквы, Яраслаўля, Калугі, Курска, Ноўгарада Вялікага, Ніжняга Ноўгарада і іншых расійскіх гарадоў, а таксама з Дона, Украіны. Гістарычна стараверства было распаўсюджана пераважна на тэрыторыі Усходняй Беларусі, у такіх гісторыка-культурных рэгіёнах, як Падзвінне і Падняпроўе. Яно прадстаўлена шэрагам напрамкаў: старавееры-папоўцы (веткаўцы), беспапоўцы-федасееўцы і беспапоўцы-піліпаўцы.

Старавееры, якія сёння пражываюць на тэрыторыі Беларусі, з’яўляюцца нашчадкамі раскольнікаў XVII – XVIII стст. У выніку міграцыйных працэсаў на тэрыторыі Беларусі ўзніклі самабытныя лакальныя культуры з відавочнай да канца XX ст. дамінуючай тэндэнцыяй самазахавання. Да апошняга часу ў асяроддзі стараверааў добра захоўваліся паўночна-рускія гаворкі, народныя традыцыі, спецыфічны менталітэт і тоеснасць з рускай традыцыйнай мастацкай культурай. У іх сустракаліся стараверскія рэдкія імёны, фіксаваліся архаічныя формы імя, якія ў стараверскім асяроддзі працягвалі існаваць пасля царкоўнай рэформы XVII ст. [2, с. 107–132.

На сучасным этапе сацыяльна-рэлігійная сітуацыя пад уплывам секулярызацыі, глабалізацыі і урбанізацыі культуры, навукова-тэхнічнага прагрэсу ў стараверскіх абшчынах Беларусі істотна змянілася. У цяперашні час ў месцах гістарычнага рассялення стараверааў іх нашчадкі складаюць прыкладна 28%. Найлепш стараверскія традыцыі захаваліся на вёсцы. Але і тут стараверскую царкву наведваюць у асноўным людзі сталага

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

ўзросту. Па прычыне знікнення былой ізаляцыі старавераў, распаўсюджвання змешаных шлюбаў, міграцыі моладзі з вёскі ў горад назіраецца адыход маладога пакалення ад рэлігіі. Рэлігійная моладзь можа хадзіць у касцёл ці праваслаўную царкву, калі яны ёсць у вёсцы. Дзеці старавераў, якія з'явіліся на свет у 1960–1980 гг., сваіх дзяцей у стараверскай царкве ўжо не хрысцяць, пераважна даюць ім звычайныя імёны. Носьбітамі рэдкіх рускіх імён зараз з'яўляюцца людзі сталага ўзросту, народжаныя ў першыя дзесяцігоддзі XX ст. Назіраецца амаль поўнае нівеліраванне традыцыйных асаблівасцей стараверскага імяннога спіса. Асабістыя імёны нованароджаных адлюстроўваюць рысы сучаснай рускай, беларускай, украінскай, польскай, літоўскай, латышскай антрапаніміі [2, с. 133–134]. Да канца XX ст. захоўвала актуальнасць стараверская сістэма запісу музычнага твора "крукамі". Сёння нашчадкі старавераў, а таксама іншых рускіх перасяленцаў па-ранейшаму ў асноўным пражываюць ва ўсходніх рэгіёнах Беларусі (Віцебская, Магілёўская, Гомельская вобласці), а таксама ў Мінску і абласных цэнтрах.

Бадай самым буйным стараверскім цэнтрам Беларускага Падняпроўя з'яўляецца горад Ветка. Паводле летапісу яе першымі жыхарамі былі маскоўскія праваслаўныя святары Казьма і Стэфан і дванаццаць сем'яў, якія былі вымушаны пакінуць радзіму і апынуліся каля Гомеля на землях магната Халецкага, дзе і заснавалі ў 1685 г. (паводле іншых звестак – у 1682 г.) горад Ветку (назва горада хутчэй за ўсё паходзіць ад назвы аднайменнага вострава, які ляжаў паміж ракой Сож і невялікай затокай).

Хутка Ветка атрымала грамату ад караля, якая гарантавала жыхарам незалежнасць і падатковыя льготы. Паселішча развівалася вельмі дынамічна, і неўзабаве разам з навакольнымі слабодамі, манастырамі і скітамі становіцца знакамітым рэлігійным і эканамічным цэнтрам расколу XVII–XVIII стст. З пачатку свайго існавання Ветка імкнулася стаць "другой Масквой". Папоўцы-веткаўцы спаборнічалі з масквічамі ў збіранні рукапісных і старадрукаваных кніг, а галоўную плошчу горада назвалі Краснай.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

У 1695 г. у Ветцы былі пабудаваны Пакроўская царква, затым Пакроўскі манастыр. Веткаўцаў адрознівала “хуткая і дакладная дасведчанасць аб апошніх падзеях ва ўсіх краях Расіі, пры выдатным веданні заходнерускага матэрыялу і павагі да іншых месц” [3, с. 8]. Мясцовыя манастыры і скіты сталі цэнтрамі пашырэння асветы і пісьменства ў рэгіёне. У XVIII ст. Ветка – гэта вялікае паселішча гарадскога тыпу, якое мела самакіраванне, шырокія рэлігійныя, культурныя і гандлёвыя сувязі. У 1730 г. тут пражывала каля 40 тыс. чалавек.

Да гэтага часу сфарміраваліся мясцовыя асаблівасці іканапісу, склалася самабытная школа разьбы па дрэве, якая спалучала аўтахтонныя беларускія, а таксама рускія традыцыі народнага архітэктурнага дэкору, так званай веткаўскай разьбы. Як жывапісны цэнтр Ветка добра вядомая з XVIII ст., калі мясцовыя абразы пачалі разыходзіцца па ўсіх стараверскіх месцах. Веткаўскі іканапіс увабраў у сябе разнастайныя мастацкія традыцыі. Над абразамі працавалі маскоўскія, паволжскія, наўгародскія, беларускія і украінскія майстры. Адной з самых папулярных ідэй у мясцовым іканапісе была ідэя гарманічнага саду (сентыментальны краявід “Мікола ў жыцці”, дэкаратыўны і арнаментальны “Дэісус”). Не будзе перабольшваннем сказаць, што ідэя гарманічнага саду была абумоўлена не толькі рэлігійным канонам, але і рэальнымі абставінамі існавання старавераў на гасціннай беларускай зямлі.

Значнасць Веткі як буйнога рэлігійнага цэнтра ўзрастала. Ветка моцна ўплывала на прыхільнікаў старой веры ў рускіх гарадах, а магчымасць жыць “добра, мірна і вольна” прыцягвала сюды новых мігрантаў. Прыхільнасць да старой веры стала асновай больш шырокага сацыяльнага незадавальнення. Гэтыя тэндэнцыі падаваліся вельмі небяспечнымі маскоўскаму ўраду. У 1732–1733 гг. былі выдадзены царскія ўказы са зваротам да жыхароў Веткі і ваколіц вярнуцца на радзіму, а затым адбылося прымусовае высяленне насельніцтва ва ўсходнія губерніі Расіі. Двойчы, у 1735 і 1764 гг., царскія войскі спальвалі горад, а мясцовыя майстры (каменшчыкі, іканапісцы, разьбяры і іншыя) вымушаны былі

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

шукаць заробкі ў Маскве, Санкт-Пецярбургу, Кіеве, і іншыя месцах. Ветка страціла сваю значнасць як цэнтр расколу, але захавала ў стараверстве гістарычны і культурны аўтарытэт.

Сёння вакол г. Веткі, дзе жывуць нашчадкі рускіх старавераў-папоўцаў, сфарміравана адна з найбольш цікавых лакальных культур на тэрыторыі Беларусі, што абумоўлена комплексам своеасаблівых гістарычных, рэлігійных, этнічных і мастацкіх характарыстык. Мастацкія традыцыі Старажытнай Русі тут па-свойму разумелі, інтэрпрэтавалі і захоўвалі. Аб гэтым сведчыць мясцовая тэхніка вышывання бісерам “у прыкрэп”, старaверскія абразы і іканапісныя традыцыі, крыжы, якія да гэтага часу сустракаюцца на варотах, весніцах, студнях, на покуці ў хатах і на могілках. У царкве можна пачуць старарускія і мясцовыя распевы, запісаныя “крукамі”.

У 1978 г. у Ветцы заснаваны музей народнай творчасці. Сваім стварэннем музей абавязаны мясцоваму жыхару, энтузіясту і народнаму ўмельцу Ф.Р.Шкляраву (1925–1988 г.). У 1987 г. у музеі адкрылася першая экспазіцыя. Экспанаты характарызуюць не толькі духоўную і матэрыяльную культуру старавераў, але і побыт, традыцыйнае мастацтва і промыслы жыхароў краю. Са старaверскіх помнікаў у музеі захоўваюцца унікальныя інкунабулы XVI–XVIII стст., рукапісы XVI – пачатку XX ст., калекцыя прорысяў XVII–XIX стст., абразы XVII – пачатку XX ст., узоры старадаўняй і сучаснай разьбы па дрэве, ліцця, шыцця золатам, жэмчугам, бісерам, мастацкага ткацтва, вышыўкі, народных строяў і інш.

Да нядаўняга часу ў сем’ях веткаўцаў ашчадна захоўваліся рукапісныя евангеллі XV–XVI стст. Па мастацкім узроўні веткаўскія рукапісы XVIII – пачатку XX ст. не саступаюць шырокавядомым рукапісным помнікам з Памор’я і Гусліц. Тут чыталі кнігі, выдадзеныя І.Фёдаравым, П.Мсціслаўцам, А.Цімафеевым-Нявежай і В.Гарабурдай, якія перадаваліся з рук у рукі як самая каштоўная спадчына. Сяляне в.Тарасаўка па-майстэрску валодалі пераплётным мастацтвам [3, с. 7–13].

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Даследчыкі фіксуюць на Віцебшчыне каля 130 поўнасцю або часткова стараверскіх паселішчаў [2, с. 135], якія ствараюць чатыры буйныя незамкнутыя арэалы, што існуюць на тэрыторыі суседніх дзяржаў і абласцей Рэспублікі Беларусь (Латвія, Літва, Расія, Мінская і Магілёўская вобласці РБ). У вёсках Падзвіння стараверы пражывалі як асобна ад беларусаў (праваслаўных і каталікоў, напрыклад, у в. Бор і Должыца Чашніцкага раёна, в. Варонка Шаркаўшчынскага раёна, в. Кублішчына Міёрскага раёна), так і з беларусамі-праваслаўнымі і каталікамі, яўрэямі (в. Германовічы Шаркаўшчынскага раёна). У многіх стараверскіх вёсках працуюць рускія пачатковыя малакамплектныя школы, дзе заняткі вядуць мясцовыя настаўнікі (в. Зазерыца Чашніцкага раёна). Па сённяшні дзень дзейнічаюць так званыя "сямейныя школы", дзе пад кіраўніцтвам самага адукаванага старога або духоўнага настаўніка дзеці вучаць царкоўнаславянскую мову, чытаюць старыя кнігі, якія захоўваюцца ў стараверскіх сем'ях і перадаюцца ў спадчыну.

Асноўная маса старавераў Падзвіння – беспапоўцы-федасееўцы, названыя так па імені іх заснавальніка Феадосія Васільева-Урусава. Упершыню яны з'явіліся тут у пачатку XVIII ст. Ф.В.-Урусаў лічыў абавязковым напісанне тытла на крыжы, праваслаўны шлюб, заключаны раней, лічыў законным і пры пераходзе ў раскол скасоўваць не дазваляў, заклікаў не маліцца чужым іконам і інш. Па прычыне адсутнасці згоды па пытаннях веры ён пакінуў радзіму разам са сваёй сям'ёй і сям'ёй брата і перасяліўся ў Невельскі павет Віцебскай губерні, дзе за кароткі час заснаваў там два манастыры – мужчынскі і жаночы. Вакол яго пачалі аб'ядноўвацца прыхільнікі, якія потым рассяліліся па ўсёй губерні. Стараверы-перасяленцы ратаваліся ад ганенняў у маланаселеных і глухіх месцах. Па даных XIX ст. у асноўным стараверы-федасееўцы аселі ў Дынабурскім, Рэжыцкім і Себежскім паветах [2, с. 136].

Беспапоўцы-піліпаўцы і папоўцы-веткаўцы на тэрыторыі Віцебскай губерні з'явіліся пазней. Піліпаўцы прыйшлі ў Віцебскую губерню з Наўгародскай губерні ў канцы XVIII ст. "во избежание правительственного правосудия за разграбление ими

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

православных церквей и монастырей" [2, с. 136]. Папоўцы-веткаўцы асабліва пацярпелі ў цараванне Ганны Іаанаўны (1730-я гг.) і пасяліліся на тэрыторыі Віцебшчыны ў Віцебскім, Суражскім, Невельскім і Лепельскім паветах [2, с. 136]. Трэба адзначыць, што ў сярэдзіне XIX ст. стараверы колькасна пераважалі на захадзе Віцебскай губерні.

"Направляясь в Витебскую губернию через Псковскую, великорусы, естественно, занимали сначала места, лежащие вблизи прямого пути на Литву, т.е. в середине уездов Люцинского, Режицкого и Динабурского, и только впоследствии двинулись в глубь губернии и заняли места, лежащие между Полоцком и Витебском, между Себежем и Невелем; некоторые двинулись дальше и рассеялись по Лепельскому уезду, а иные засели вокруг Витебска… В то время нынешние белорусские губернии находились в руках Польши, которая и принимала беглецов под свое покровительство, наделяя их землей, с тем, чтобы они за это охраняли границы польских владений. Пользовавшиеся на таких условиях землей назывались панцирными боярами. Впоследствии некоторым помещикам удалось закрепостить великорусов, живущих на их землях, но большинство из них все-таки осталось людьми вольными... Владельцы огромных пущ и необработанных имений в их лице приобретали дешевую и надежную рабочую силу… Заселение порожних лесистых имений частных владельцев и монастырей, которые ранее не приносили им никакой пользы, было находкою для хозяев и поселенцев. Аренда была ничтожною и только с половины XVIII ст. стала оформляться контрактами, писанными в простой, не стеснительной для сторон форме" [2, с. 137]. Пасля паўстання 1863 г. пад кіраўніцтвам К.Каліноўскага царскі ўрад пачаў актыўную палітыку русіфікацыі тэрыторыі, былі адчынены спецыяльныя касы, якія выдавалі сялянам-старaверам пазыкі на набыццё зямлі.

Спецыфіка рэлігійнай культуры, кампактныя ўмовы пражывання, самабытныя мастацкія традыцыі садзейнічалі таму, што на працяглы час стараверы Падзвіння закансервавалі асаблівасці

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

мацярынскай духоўнай і матэрыяльнай культуры, гаворак. Мовазнаўцы адносяць гаворку старавераў Падзвіння да заходніх сярэднерускіх акаючых гаворак пскоўскага тыпу. “Яны застаюцца вернымі сваёй мове, барадзе, доўгім кафтанам і высокім ботам” – такі партрэт старавераў малявалі даследчыкі. Моцная рэлігійная і этнічная самасвядомасць старавераў не дазваляе гаварыць аб поўнай асіміляцыі іх на тэрыторыі Беларусі.

У народнай прозе Віцебскага Падзвіння этнолагамі зафіксаваны шэраг матэрыялаў, якія раскрываюць спецыфіку этнаканфесійных асаблівасцей рэгіёна [4, с. 762, 784, 787, 788, 789].

На працягу гісторыі насельніцтва беларускіх рэгіёнаў выпрацавала аптымальныя механізмы суіснавання і ўзаемадзеяння з прадстаўнікамі розных этнасаў і канфесій. Гэта справядліва і ў адносінах да старавераў, якія прыйшлі на беларускія землі толькі ў XVII ст., але нягледзячы на рэлігійныя, моўныя і бытавыя адрозненні ад мясцовага насельніцтва знайшлі ў Беларусі новую радзіму і паразуменне.

Культура старавераў у Беларусі мае шэраг агульных рыс з культурай старавераў у іншых краінах і рэгіёнах свету, разам з тым яна вылучаецца і сваімі адметнасцямі. Культура беларускіх старавераў фарміравалася не толькі пад уплывам рускай рэлігійнай і мастацкай традыцыі, але ўключыла ў сябе традыцыі іншых народаў (украінцаў і беларусаў). Па-першае, тлумачыцца гэта тым, што на тэрыторыі Беларусі апынуліся людзі розных сацыяльных груп – перасяленцы з Масквы, Яраслаўля, Калугі, Курска, Ноўгарада Вялікага і Ніжняга, а таксама з Дона і Украіны. Па-другое, прыклады сведчаць, што на тэрыторыі Беларусі паміж стараверамі і прадстаўнікамі розных этнасаў і рэлігій адсутнічаў відавочны кагнітыўны дысананс. Для сучаснага перыяду сэнсавыя бінарныя апазіцыі, актуальныя для старавераў у адносінах да асяроддзя ў мінулым, такія як традыцыя – навацыя, сапраўднае – несапраўднае, радзіма – выгнанне, свае – чужыя і іншыя, амаль страцілі сваю ранейшую значнасць.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Звесткі пра культуру Беларускага Падзвіння і Падняпроўя пераконваюць у тым, што мясцовая культура, якая на працягу стагоддзяў развівалася на дыялагічных асновах паміж рознымі этнасамі (беларускі, рускі, украінскі, польскі і інш.) і канфесіямі (праваслаўе, каталіцызм, пратэстантызм, стараверства і інш.), у выніку парадзіла шэраг адметных лакальных культур на тэрыторыі вышэйзгаданых рэгіёнаў, заснаваных на прынцыпе так званай “канфігуратыўнай інтэграцыі”.

Такая інтэграцыя ўяўляе сабой інтэграцыю “па падабенстве” і ўзнікае тады, калі шэраг культур адпавядаюць нейкаму агульнаму патэрну, маюць агульную, скразную тэму. Такой тэмай у дачыненні да акрэсленых тэрыторый можа выступаць тэма хрысціянства і агульнай усходнеславянскай культурнай спадчыны. Агульная гісторыя і культура, рэлігійныя традыцыі – надзейны фундамент для гарманічнага суіснавання розных этнасаў і канфесій на тэрыторыі Беларусі ў мінулым, сучасным і будучым.

---


1. *Беларусь* шматнацыянальная / аўтар тэксту і складальнік Л.Міхальчук. – Мн.: Рыфтур, 2005. – 47 с.

2. *Белорусское* Поозерье: язык и духовная культура / А.М.Мезенко [и др.]; под ред. А.М.Мезенко, А.В.Русецкого. – Мн.: Бел. наука, 2001. – 214 с.

3. *Веткаўскі* музей народнай творчасці / аўт. уступ. арт. Г.Р.Нячаева, С.І.Лявонцьева; склад. Г.Р.Нячаева, С.І.Лявонцьева, Ф.Р.Шкляраў. – 3-е выд. – Мн.: Беларусь, 2001. – 119 с.

4. *Традыцыйная* мастацкая культура беларусаў: у 6 т. – Мн.: Бел. навука, 2001–2007. – Т. 2: Віцебскае Падзвінне / Т.Б.Варфаламеева [і інш.]; склад. Т.Б.Варфаламеева. – Мн.: Бел. навука, 2004. – 910 с., іл.


БИБЛИОТЕКА БГУКИ